ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення
культуры Гродзенскага
аблвыканкама
А.В. Клімовіч
9 студзеня 2024 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення
абласнога фестывалю народнай
творчасці ветэранскіх калектываў
"Не старэюць душой ветэраны"

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны" (далей - Фестываль).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з'яўляюцца: стварэнне спрыяльных умоў для развіцця ветэранскіх калектываў і рэалізацыі творчых здольнасцей; павышэнне ўзроўню выканальніцкага майстэрства і сцэнічнай культуры; прапаганда лепшых узораў вакальна-харавога мастацтва; актывізацыя творчай дзейнасці, далучэнне ў калектывы новых удзельнікаў; павышэнне ролі творчых ветэранскіх калектываў у патрыятычным выхаванні моладзі; павышэнне сацыяльнага статусу пажылых людзей; захаванне лепшых узораў песеннай спадчыны і папулярызацыя патрыятычнай песні; арганізацыя вольнага часу ветэранаў вайны і працы.

3. Арганізатарамі Фестывалю з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная установа культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" (далей – ДУК "Гродзенскі АМЦНТ"), сектар культуры Іўеўскага райвыканкама, аддзел культуры Ваўкавыскага райвыканкама (дадатак 1).

4. У Фестывалі прымаюць удзел лепшыя ветэранскія харавыя калектывы, вакальныя ансамблі і індывідуальныя выканаўцы з іх складу.

5. Ветэранскія калектывы рыхтуюць канцэртныя праграмы працягласцю не больш 20 хвілін і не болей, чым 5 нумароў, у тым ліку:
- вакальна-харавых твораў (не менш 3 нумароў);
- твораў вакальных груп;
- салістаў-вакалістаў ці салістаў-інструменталістаў;
- дуэтаў і інш.

Абавязковым з'яўляецца выкананне 1 твора ваенна-патрыятычнай тэматыкі.

6. Выкананне музычных твораў пажадана выконваць пад інструментальную (акампаніруючую) групу.

7. Не дазваляецца выкананне больш 2 твораў самадзейных аўтараў.

8. Да ўдзелу ў Фестывалі дапускаецца ад кожнага раёна не больш за 2 лепшыя калектывы, ад г. Гродна – не больш за 5. У выпадку наяўнасці болей 2-х ветэранскіх калектываў у раёне і г. Гродна праводзяцца адборачныя этапы.

9. Усе вакальна-харавыя калектывы, вакальныя групы ўзнагароджваюцца дыпломамі ўдзельніка ў рамках і прызамі.

10. Дыпломамі і спецыяльнымі прызамі ўзнагароджваюцца індывідуальныя выканаўцы з ліку ўдзельнікаў калектываў: лепшы акампаніятар, дырыжор, канцэртмайстар, саліст-вакаліст, саліст-інструменталіст.

11. Пры падвядзенні вынікаў Фестывалю журы (дадатак 3) карыстаецца наступнымі крытэрыямі: выканальніцкае майстэрства; сцэнічная культура; мастацкі ўзровень рэпертуару; арыгінальнасць апрацоўкі; рэжысура канцэртных нумароў; якасць музычнага суправаджэння ці фанаграмы.

12. Па выніках выступленняў журы вылучае лепшы калектыў для ўдзелу ў заключных мерапрыемствах Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны" ці лепшых салістаў для ўдзелу ў заключным канцэрце Рэспубліканскага вакальнага конкурсу сярод ветэранаў "Песни Победы" ў г. Мінск.

13. Рашэнне членаў журы па выніках Фестывалю фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарных дзён з дня правядзення Фестывалю на афіцыйным сайце ДУК "Гродзенскі АМЦНТ".

14. Фестываль праводзіцца кожны год.

15. У 2024 годзе Фестываль адбудзецца 16 сакавіка ў г. Іўе і 17 сакавіка ў г. Ваўкавыск адпаведна графіка (дадатак 2).

16. У выпадку пераносу тэрмінаў правядзення Фестывалю ці яго адмены па аб'ектыўных прычынах калектывы, якія даслалі заяўкі, будуць паведамлены індывідуальна.

17. Для ўдзелу ў Фестывалі неабходна даслаць заяўку (дадатак 4) с пазнакай "Не старэюць душой ветэраны" да 14 лютага 2024 года па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК "Гродзенскі АМЦНТ"; кантактныя тэлефоны: +375152623799; тэл./факс: +375152623787, e-mail: info@gromc.by

18. Праграмы выступленняў калектываў дасылаюцца дадаткова да 1 сакавіка на электронны адрас: info@gromc.by

19. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі АМЦНТ" на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

20. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, спецыяльныя прызы, дыпломы, рамкі для дыпломаў.

21. Для фінансавання Фестывалю могуць быць выкарыстаны сродкі Гродзенскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў; абласнога аддзялення Беларускага фонду міру; абласнога Савета ветэранаў, а таксама іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

22. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

23. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне запісаў выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта*; |
| Цысар А.Б. | намеснік старшыні Іўеўскага райвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта*; |
| Салавей І.А. | намеснік старшыні Ваўкавыскага райвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта*; |
| Кішкель С.В. | загадчык сектара культуры Іўеўскага райвыканкама, *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Ляховіч В.І. | начальнік аддзела культуры Ваўкавыскага райвыканкама, *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Бычак В.А. | дырэктар ДУК "Ваўкавыскі гарадскі Дом культуры"; |
| Калбаска І.В. | старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага фонду міру; |
| Лісковіч В.А. | старшыня Гродзенскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў; |
| Малевіч Д.В. | старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму; |

| | |
|---|---|
| Маржала С.Г. | дырэктар ДУК “Ваўкавыскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”; |
| Мерчы Т.І. | вядучы метадыст па музычна-інструментальным жанры ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Ракець С.А. | дырэктар ДУК “Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу”; |
| Тустаў І.Ф. | старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага грамадскага аб’яднання ветэранаў |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

# ПЛАН ПРАВЯДЗЕННЯ
## абласнога фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

16 сакавіка 2024 г.
12:00

ДУК "Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу"

Прымаюць удзел:
1. Астравецкі раён
2. Ашмянскі раён
3. Воранаўскі раён
4. Дзятлаўскі раён
5. Іўеўскі раён
6. Карэліцкі раён
7. Лідскі раён
8. Навагрудскі раён
9. Смаргонскі раён
10. Шчучынскі раён

17 сакавіка 2024 г.
11:00

ДУК "Ваўкавыскі гарадскі Дом культуры"

Прымаюць удзел:
1. Бераставіцкі раён
2. Ваўкавыскі раён
3. Гродзенскі раён
4. Зэльвенскі раён
5. Мастоўскі раён
6. Свіслацкі раён
7. Слонімскі раён
8. г. Гродна

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

## СКЛАД ЖУРЫ
абласнога фестывалю народнай творчасці
ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы;* |
| Мерчы Т.І. | вядучы метадыст па музычна-інструментальным жанры ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" *намеснік старшыні журы;* |
| Калбаска І.В. | старшыня абласнога аддзялення Беларускага фонду міру; |
| Малевіч Д.В. | старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных установ упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Тустаў І.Ф. | старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" |

Дадатак 4
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектара) культуры гар(райвыканкама)

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным фестывалі народнай творчасці ветэранскіх калектываў "Не старэюць душой ветэраны"

1. Раён ______________________________
2. Поўная назва калектыву і базавая ўстанова дзейнасці ______________
______________________________
3. Прозвішча, імя, імя па бацьку мастацкага кіраўніка калектыву, кантактны тэлефон (мабільны) ______________________________

4. Колькасць удзельнікаў калектыву______________________________
5. Канцэртная праграма калектыву (прозвішча, імя, імя па бацьку аўтараў пісаць без скарачэнняў)______________________________
______________________________
6. Каляровая фатаграфія і кароткая творчая характарыстыка калектыву (да 30 слоў) ______________________________

Кіраўнік калектыву ______________
(подпіс)

***Заўвага:*** *у спісе канцэртнай праграмы абавязкова ўказваюцца імя і прозвішча кіраўніка калектыву, кіраўніка аркестравай групы, акампаніятара, салістаў і г.д.* ***Заяўка дасылаецца ў фармаце WORD і PDF (з пячаткай і подпісам).***